Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

**Хроніка**

**Культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за лістапад 2015 г.**

## Мерапрыемствы ў рамках месячніка папулярызацыі нацыянальнай мастацкай літаратуры “Маіх радкоў няма без Беларусі”

**8 лістапада**

Пасяджэнне клуба сямейнага чатання прапанавала здзейсніць экскурс ў мінулае. Увазе наведвальнікаў падрыхтавана выстава рэчаў дамашняга абіходу сялянскай хаты (печ, лаўка, рушнікі, чыгункі, верацёны, чаўнакі, калаўроты, пралкі двух выглядаў, качалкі і прасы на вуглях і інш.). Члены клуба разгадвалі загадкі пра рэчі з сялянскага падворку. Для гасцей прадстаўлена кніжная выстава “Добры дзень, кніжка беларуская”. Сумесна з запрошанымі доўгажыхаркамі в. Шамятоўка Грыбоўскай З. В. і Мартынчук Л. М. гаварылі пра тое, як жылі нашы продкі, чым займаліся, як быў наладжаны іх быт, якія мелі яны звычаі і традыцыі, абрады. Госці падзяліліся з аўдыторыяй успамінамі аб дзяцінстве. Да ўвагі прапанаваны вершы “Рушнік” М. Пазнякова, “Калыска мая залатая” і інш.

Шамятоўская СБ, 19 чал.

**14 лістапада**

Гадзіна сучаснай беларускай паэзіі “Я шукаю сваю душу у вершах” з поспехам прайшла для юнай чытацкай аўдыторыі у рамках абласнога месячніка і прысвечана таленавітай паэтэсе Ніне Мацяш. Дзеці пазнаёміліся з багатай і цікавай паэзіяй Берасцейшчыны, уважліва слухалі вершы “Сябрам”, “Матылёк”, “Пастушок” і інш. Актывна адказвалі на пытанні віктарыны “Паэты Берасцейшчыны”. Пераможцы отрымалі прызы.

ДБ, 15 чал.

**15 лістапада**

Мэтай фальклорнага падарожжа “Зямля, дзе пачаўся твой лёс” стала знаёмства з мінулым нашага краю, абуджэнне цікавасці да яго культуры і гісторыі. Чытачам прапанавана выстава “Рэха даўняга часу” з рэчаў дамашняга абіходу сялянскай хаты. Юным наведвальнікам прапанавана электронная прэзентацыя “Кобрыншчына”, пасля якой дзеці актыўна разгадвалі загадкі, з дапамогай кніг шукалі прыказкі і прымаўкі, прысвечаныя беларускаму быту. Пад канец мерапрыемства юныя чытачы спрабавалі прасаваць рушнікі.

Шамятоўская СБ, 23 чал.

**20 лістапада**

Літаратурная гадзіна па творчасці У. Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”. У яе рамках прадэманстравана прэзентацыя Тышкевіч Карыны, вуч. 7 кл., у час якой прысутныя пазнаёміліся з асноўнымі вехамі жыцця і творчасці пісьменніка, прадстаўлены элементы побыту, хатнія прылады і абсталяванне з мінулага беларускай вёскі. Праведзена гульня-віктарына па творчасці У. Караткевіча “На матчынай мове”.

Верхалеская СБ, 18 чал

**21 лістапада**

Ва ўрачыстым становішчы глядзельнай залы ў Дзівінскім СДК прайшоў творчы вечар "Под уходящим листопадом" члена ЛПГ "Праметэй" Момлік Н. І. і кіраўніка квінтэта "Добры вечар" Кірыеўскага А. П. У праграме прагучалі песні Кірыеўскага А. П. на вершы Момлік Н. І. у выкананні салістаў Дзівінскага СДК, бібліятэкара Гурыш Т. А., выканаўца Ў. Салаўя, музычнага ансамбля "Заранiца" і самога аўтара. Аляксей Паўловіч і Надзея Іванаўна прымалі віншаванні ад гасцей вечара: карэспандэнта газеты "Кобрынскі веснік" Н. Кандрашук, прадстаўніка аддзела культуры, ідэалагічнай працы і па справах моладзі Пьянцавай В. В., старшыні Кобрынскай РООО БелТІЗ Смяховіч В. Н. і інш.

Дзівінская СБ, 50 чал.

**23 лістапада**

Праведзена літаратурная вечарына “Быў. Ёсць. Буду”, прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння У. Караткевіча. Вучні 6 - 8 класаў пазнаёміліся з жыццёвым і творчым шляхам пісьменніка, асноўнымі тэмамі яго творчасці, гісторыяй напісання кніг “Нельга забыць”, “Зямля пад Белымі крыламі”. Расказ суправаджаўся паказам відэапрэзентацыі.

Лукская СБ, 20 чал.

**30 лістапада**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбылася творчая сустрэча з пісьменнікам Уладзімірам Арловым, перакладчыкам Зміцерам Бартосікам. У ходзе мерапрыемства прадстаўлена мультымідыйная прэзентацыя кнігі У. Арлова “Імены свабоды”. З. Колас і Л. Баршчэўскі пазнаёмілі прысутных з сваімі перакладамі сусветнай класікі на беларускую мову. У выкананні барда З. Бартосіка прагучалі песні Б. Акуджавы і рускія рамансы на беларускай мове. Прысутныя на сустрэчы малі магчымасць задаць шматлікія пытанні пра творчыя планы гасцей, на якія былі атрыманы цікавыя адказы.

ЦРБ, 50 чал.

**<u>Мерапрыемствы ў рамках абласной інфармацыйна-адукацыйнай акцыі "Сусветны дзень непалення"</u>**

**14 лістапада**

Удзельнікамі ролевай гульні "Владеешь информацией – владеешь ситуацией" сталі навучэнцы старэйшых класаў. Гутарка вялася з выкарыстаннем матэрыялаў выставы па здароваму ладу жыцця. Падлеткі былі падзелены на дзве групы: першая - задавала пытанні пра курэнне, другая - адказвала на пастаўленыя пытанні. Пераможцы атрымалі прызы. У канцы гульні увазе дзяцей прапанаваны відэаагляд аб шкодзе курэння.

Магдалінская СБ, 10 чал.

**19 лістапада**

Стрыгаўская бібліятэка арганізавала тытунь-шоу "Дзякуй, не куру!" Дзеці з цікавасцю прагледзелі прэзентацыю "Мы супраць курэння", актыўна адказвалі на пытанні віктарыны "Што ўтойвае ў сябе цыгарэта", з задавальненнем прачыталі вершы "Пра цыгарэту". Карысна і прыемна было атрымаць маладым чытачам пад канец мерапрыемства напамінку "Ілюзіі курца".

Стрыгаўская СБ, 10 чал.

**20 лістапада**

Шмат цікавых і разнастайных фактаў пра шкоду курэння пазналі дзеці, якія прыйшлі ў бібліятэку на гульню-дыялог "Курэнне: погляд на праблему". Дзеці адказвалі на пытанні, успаміналі прыказкі і прымаўкі, мяняліся думкамі і пажаданнямі, слухалі цікавую інфармацыю і глядзелі відэафільм «Праўда пра тытунь».

Арэхаўская СБ, 20 чал.

**<u>Іншыя мерапрыемствы</u>**

**02 лістапада**

Арганізаваны і праведзены Дзень вясёлых забаў "Восень - цудоўная пара". Дзеці пазнаёміліся з народнымі прыметамі восені, праслухалі агляд дзіцячай літаратуры, прынялі ўдзел у віктарыне "Скончы прыказку", актыўна разгадвалі загадкі, гулялі, малявалі.

Пескаўская СБ, 18 чал.

**06 лістапада**

У апошні дзень месячніка "Чалавек з белым кіем" прайшоў вечар-сустрэча з чытачамі "Соучастие в судьбе". Былі запрошаны чытачы - члены

БелТІЗ: старшыня Кобрынскага раённага таварыства інвалідаў па зроку Смяховіч В. М., заг. Дзівінскай участковай лякарні Дэйка А. І., дзіцячы доктар Дэйка Л. П. Смяховіч У. Н. прадставіла праект па сацыяльнай рэабілітацыі пажылых інвалідаў, які будзе рэалізоўвацца ў 2016г. Госці адказалі на пытанні прысутных, азнаёмілі з графікам выезду вузкіх спецыялістаў у Дзівін, паказалі комплекс гімнастыкі для вачэй. Фальклорны калектыў СДК выканаў некалькі музычных нумароў, а члены ЛПГ "Праметэй" прадставілі на суд гледачоў свае новыя паэтычныя творы.

Дзівінская СБ, 21 чал.

**11 лістапада**

У памяць аб спаленай вёсцы Чаравачыцы Батчынская бібліятэка і Дом культуры прадставілі ўвазе гледачоў літаратурна-музычную кампазіцыю «Застаўся ў сэрцы вечны след вайны». У бібліятэцы афармлена кніжная выстава «Прайшла праз дзяцінства вайна", падрыхтавана прэзентацыя «Памяць сэрца». У фае Дома культуры арганізавана фотавыстава «Агнём вайны адзначаны». З вялікай цікавасцю прайшла і акцыя пад назвай «Дзіцячыя далоні за мір ва ўсім свеце".

Батчынская СБ, 25 чал.

**12 – 15 лістапада**

Увазе наведвальнікаў бібліятэкі прадстаўлена выстава народнай творчасці "Кірмаш майстэрства". Экспазіцыя уключала вырабы мясцовых умельцаў: вышыўкі Парфенюк А. І. і Актысюк Л. В., шкатулкі, вазы і іншыя сувеніры з газетных трубачак Балабушкі Г. С. Прадставіла свае работы і пазнаёміла з тэхналогіяй алмазнай вышыўкі Лук'яновіч В. В. Прышкольны кружок "Беларуская народная творчасць" прапанаваў лялькі-абярэгі. Дзіцячы сад падзяліўся з бібліятэкай лепшымі малюнкамі і вырабамі. Зроблена падборка і прэзентацыя галіновай літаратуры, перыядычных выданняў і інтэрнэт-матэрыялаў па тэме выставы.

Верхалеская СБ, 96 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.

Тэл. 2 36 81